ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НАСТОЙЛІВА АВАЛОДВАЙЦЕ ВЕДАМІ, КУЛЬТУРАЙ, ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫМ МАЙСТЭРСТВАМ! БУДЗЬЦЕ СВЯДОМЫМІ БАРАЦЬБІТАМІ ЗА СПРАВУ ЛЕНІНА, ЗА КАМУНІЗМ!

(З Заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая 1983 года).

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983

21

КРАСАВІКА

ЧАЦВЕР

№ 15 (1391)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"

ТЭЛЕТАЙП

• Учора • Сёння • Заўтра •

ТУРНІР

па міні-футболу, прысвечаны 113-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, прайшоў у спартыўнай зале універсітэта. Ён быў арганізаваны па ініцыятыве камітэта ЛКСМБ і сабраў шмат ўдзельнікаў і гледачоў. Каманды зямляцтваў студэнтаў з Афганістана, Малі, Грэцыі, Калумбіі, Алжыра, ГДР, Мадагаскара і зборная каманда факультэта журналістыкі былі разбіты на дзве падгрупы. Пераможцамі у падгрупах сталі каманды Мадагаскара і факультэта журналістыкі, якія і сустрэліся паміж сабой у фінале. Напружаны паядынак паміж гэтымі камандамі закончыўся ўнічыю — 0:0. Па пенальці перамагла каманда зямляцтва Мадагаскара.

Б. УЛАДЗІМІРАЎ,
член інтэрпрэс-цэнтра.

НА БЮРО ПАРТКОМА

разгледжана пытанне аб ходзе выканання пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым уздыме масавасці фізічнай культуры і спорту». У дакладзе загадчыка кафедры фізвыхавання і спорту С. У. Макарэвіча было адзначана, што ва універсітэце праробле на пэўная работа па ўдасканаленню фізкультуры і спорту, расшырэнню масавай аздараўленчай, фізкультурнай і спартыўнай работы.

Бюро парткома рэкамендавала партбюро факультэтаў, дэканатам, кафедры фізвыхавання, спортклубу, грамадскім арганізацыям звярнуць увагу на больш шырокае ўцягненне студэнтаў універсітэта ў рэгулярныя заняткі фізічнай культурай і спортам, у масавыя спаборніцтвы.

М. КУЧЫНСКІ,
старшыня спартыўна-масавай камісіі прафкома.

НА ВЕЧАРЫ КІНО

«Цікавы фільм. Што гэта значыць! [Да спрэчак аб фільмах апошніх гадоў]» выступіла доктар філалагічных навук, вядомы кінакрытык Е. Л. Бондарава. У заключэнне дэманстраваліся фрагменты з фільмаў «Каліна чырвоная», «Масква слязам не верыць», а таксама кінанастужка «Восеньская саната».

В. ЧАРНЯЎСКІ,
член прэс-цэнтра прафкома.

Не месца ўпрыгожвае чалавека

ВОСЬ І ЗАКОНЧЫЛАСЯ мая вучоба ва універсітэце. Засталося здаць дзяржаўныя экзамены, і кожны з нас, выпускнікоў, прысвеціць сябе той рабоце, да якой ішоў пяць гадоў. Цікавая работа, новы працоўны калектыў... Усё гэта будзе праз паўгода, а пакуль толькі што закончылася размеркаванне нашага патока. У асноўным усе мы паедзем працаваць у сельскія школы. Мы разумеем, як нас там чакаюць. Разумеем, што працаваць там нялёгка. Але ж мы — камсамольцы! І каму, як не нам, быць там, дзе цяжэй. Прыемна ўсведамляць, што большасць камсамольцаў нашага патока са шчырым жаданнем едуць працаваць у сельскія школы.

Што датычыць мяне, то я заўсёды марыў працаваць з дзецьмі. Закончыўшы сярэднюю школу ў вёсцы, я выразна ўяўляю сабе работу сельскага настаўніка.

Па размеркаванню еду працаваць у Капыльскі раён. Вядомая пагаворка сцвярджае: «Не месца ўпрыгожвае чалавека, а чалавек месца». Я ўпэўнены, калі працаваць з жаданнем, цалкам аддаючы сябе любімай справе, то ўсюды можна заслужыць давер і павагу людзей, а гэта, на мой погляд, значыць быць шчаслівым.

Таму я звяртаюся да ўсіх выпускнікоў універсітэта, якія ў верасні гэтага года ўвойдуць у школьныя класы: прынясіце з сабой камсамольскі запал і аптымізм, не губляйцеся перад цяжкасцямі і няўдачамі, заўсёды і ўсюды памятайце, што вы — выпускнікі БДУ імя У. І. Леніна.

І. БАБКО,
студэнт 5-га курса, намеснік сакратара камітэта камсамола фізфака.

Табе, «чырвоная субота»!

ПАЛІГРАФІЧНЫ камбінат імя Якуба Коласа. Горача віталі 16 красавіка рабочыя і служачыя прадпрыемства студэнтаў з Лівана, Палесціны, Іарданіі, Народна - Дэмакратычнай Рэспублікі Емен, якіх прывялі сюды пазыўныя «чырвонай суботы». Юнакоў і дзяўчат з краін Блізкага Усходу аб'ядналa ў гэты дзень агульнае пачуццё: удзячнасць радзіме вялікага Леніна за падтрымку ў справядлівай барацьбе супраць міжнароднага імперыялізму і сіянізму. Дружна працавалі студэнты факультэта журналістыкі, іх таварышы з фізфака і падрыхтоўчага аддзялення.

«Нас, палесцінскіх студэнтаў, — сказаў старшыня ўсеагульнага саюза палесцінскіх студэнтаў у горадзе Мінску Хані Махамед, — аб'ядноўвае сёння пачуццё інтэрнацыяналізму і салідарнасці з усімі, каму дарагія мір, свабода, шчасце».

Захапленне мужнасцю шматпакутнага народа Палесціны выказаў у сваім выступленні сакратар камітэта камсамола паліграфкамбіната Міхаіл Грудзін.

НАЗІХ САЛЕМ,
студэнт факультэта журналістыкі.

* * *

16 КРАСАВІКА афганскія юнакі і дзяўчаты, што займаюцца ў ВНУ і тэхнікумах сталіцы, прыйшлі на Мінскі маторны завод на Усесаюзны камуністычны суботнік. Сярод іх былі і студэнты БДУ імя У. І. Леніна.

Суботнік пачаўся з урачыстага мітынгу, на якім выступілі работнікі прадпрыемства. Сваімі працоўнымі планамі на гэты дзень падзяліліся ветэраны і моладзь завода, старшыня гарадской партыйнай арганізацыі НДПА таварыш Хаміль.

А затым пачаўся напружаны працоўны дзень. З добрым настроем працавалі студэнты. Кожны з іх ведаў: энергія, запал, што набудуць яны на ленінскім суботніку, спатрэбяцца на радзіме.

В. НЕШАТ,
студэнт факультэта журналістыкі.

У мінулым годзе Леанід МАРОЗ закончыў універсітэт і цяпер працуе на біялагічным факультэце. Тэма яго навуковых даследаванняў — электрафізіялогія нервовых клетак, і займаецца ён ёю яшчэ са студэнцкіх гадоў. Дарэчы, установу, на якой працуе, сабраў уласнымі рукамі.

Разам з навуковымі даследаваннямі камсамолец шмат часу і ўвагі аддае ўдзелу ў грамадскай рабоце. Леанід нярэдка выступае на камсамольскіх сходах з дзелавымі, канкрэтнымі прапановамі. І наогул, яму ўласцівы творчы неспакой і клопат за агульную справу.

Фота В. Шачака.

ЭНЕРГІЯ АСАБІСТАГА ПРЫКЛАДУ

ПАСЛЯ ЗАКАНЧЭННЯ сярэдняй школы яна не стаяла на раздарожжы: куды пайсці вучыцца далей? У жыццё Святланы Максіменка фізіка ўвайшла з дзяцінства: бацькі яе закончылі фізічны факультэт БДУ. Яна закончыла школу з залатым медалём. Упэўненай рукой адчыніла Святлана дзверы, за якімі жыла яе мара, жыла і вабіла да сябе. А што чакала там? Першы экзамен здала на «выдатна». І пачалося студэнцкае жыццё.

У памяці засталася першая студэнцкая «бульба». Амаль што незнаёмыя хлопцы і дзяўчаты сабраліся на свой першы камсамольскі сход: трэба было выбраць камісара сельскагаспадарчага атрада. І не абы каго, а такога чалавека, які б дапамог згуртавацца студэнтам у сапраўдны калектыў.

Спрачаліся доўга: каму даверыць такую адказную пасаду? І тут устаў зусім незнаёмы Святлане хлопец і сказаў:

— Я ведаю, хто здолее, — і прапанаваў яе кандыдатуру.

Не паспела Святлана апамятацца, як за яе прагаласавалі.

— Добра, я буду камісарам, — згадзілася дзяўчына. Але ўсё ж падумала: «А раптам не спраўлюся?».

Ужо потым, калі падзялілася сваімі сумненнямі з сяброўкамі, тыя супакоілі: «Не хвалюйся, усё будзе добра. Калі што не атрымаецца — дапаможам».

І Святлана з радасцю ўзялася за справу: выбар групы часткова супадаў з яе асабістымі думкамі.

— Яшчэ да «бульбы» я пазнаёмілася амаль з усімі студэнтамі групы, — расказвае Святлана. — Але не падабалася мне ў нашых узаемаадносінах тое, што ўсе мы разбіліся на асобныя групкі. І мне захацелася аб'яднаць іх у адзіны згуртаваны калектыў.

Прайшоў час — і ніхто не пашкадаваў, што іменна Святлана стала ідэалагічным кіраўніком атрада. Паступова з групак стаў складвацца калектыў, паявіліся агульныя інтарэсы. Па ініцыятыве Святланы Максіменка на сельгасработах рыхтавалі і праводзілі вечары ў сельскай школе, выходзілі насценныя газеты.

Калі, сабраўшыся ў адной з аўдыторый фізічнага факультэта, камсамольцы першай групы выбіралі камсорга, іншых прапаноў не было: усе спыніліся на кандыдатуры Святланы.

Работа камсорга пачынаецца заўсёды з наладжвання кантакту з калектывам. Святлане было лягчэй: касцяк групы сфарміраваўся на «бульбе».

— Ведаеце, ёсць такія людзі, пра якіх гавораць: цяжкія на пад'ём,—усміхаецца Святлана. — У нашай групе такіх няма. Наадварот, трэба толькі прапанаваць што-небудзь, зацікавіць, і студэнты падтрымаюць з вялікай ахвотай.

— На першым курсе, — успамінае Іна Траццяк, прафорг групы,—рыхтаваліся да агляду мастацкай самадзейнасці факультэта. Трэба было правесці рэпетыцыю, а аўдыторыі свабоднай няма. Света прапанавала паехаць да яе дамоў. Там і рэпеціравалі. А на аглядзе нядрэнна выступілі. І наогул, Света за ўсё душой хварэе.

У гэтым годзе Святлану Максіменка выбралі старшынёй грамадскай прыёмнай камісіі фізфака. Клопатаў стала яшчэ больш. Колькі намаганняў трэба прыкласці, каб зацікавіліся дзесяцікласнікі фізічным факультэтам, каб пацягнула іх сюды, дзе вучыцца такая дружная першая група, дзе вучыцца Святлана Максіменка.

І. САЎЧУК,
студэнтка факультэта журналістыкі.

ВАКОЛ АЎТАРЫТЭТУ

...«КАРЫСТАЕЦЦА АЎТАРЫТЭТАМ сярод сваіх таварышаў» — гэтыя словы добра знаёмы кожнаму з нас. Іменна ўсе, амаль без выключэння, прынеслі ўласныя характарыстыкі з такімі словамі ў прыёмную камісію. Здавалася б, што ўсе твае будучыя сябры і знаёмыя — цікавыя людзі, якія ўмеюць захапіць і павесці за сабой, дапамагчы ў цяжкую хвіліну. Але чаму ў жыцці ўсё атрымліваецца не зусім так?

Пра гэта я размаўляла з двума камсоргамі: Уладзімірам Варанковым, камсоргам 1-й групы 3-га курса хімічнага факультэта і з Таццянай Калацкай, камсоргам 4-й групы 4-га курса геаграфічнага факультэта.

Слова — Уладзіміру ВАРАНКОВУ:

— Камсоргам я ўжо трэці год. Выбралі на першым сходзе. У групе — адны хлопцы. У 1982 годзе група па паспяховасці заняла 1-е месца ва універсітэце сярод акадэмічных груп. На маю думку, аўтарытэтны камсорг павінен быць ініцыятыўным, добра разумець людзей, каб паспяхова працаваць. Мне ў многім дапамагае куратар Ала Фёдараўна Папова. Нядаўна разам правялі вечар сімфанічнай музыкі, які, мяркуючы па водгуках, атрымаўся нядрэнна. Шчыра кажучы, я не хацеў быць камсоргам, але калі мяне абралі, я ўжо не мог нічога рабіць абы-як.

А вось што лічыць Таццяна КАЛАЦКАЯ:

— Аўтарытэтны камсорг — гэта не абавязкова-выдатнік вучобы, але ён павінен добрасумленна адносіцца да даручэнняў, нават самых маленькіх. У рабоце з людзьмі не бывае дробязей. А яшчэ многае залежыць ад групы. Думаю, што без сваёй групы я зусім і не аўтарытэт, а вось разам мы — аўтарытэтны калектыў. Лічу, што гэта галоўнае.

Ж. ЖМАЙЛІК,
студэнтка факультэта журналістыкі.

СЛОВАМ ДАРАЖЫЦЬ УМЕЙЦЕ

Гаворка пойдзе не пра спрэчку, нават не пра размову, якая не адбылася і не выявіла належных прычын, а пра тое, што адсутнасць шчырай размовы вылілася дыяметральнасцю поглядаў некаторых актывістаў на вельмі важную праблему.

ДРЭННАЯ ГРУПА, адстаючая. Часта гэтыя азначэнні настолькі прыліпаюць да назоўніка, што ў паняцці «дрэнная група» канцэнтруюцца ўсе нашы ўяўленні аб самых адстаючых студэнтах, якія не ходзяць на заняткі, на двойкі здаюць экзамены, зрываюць мерапрыемствы. І бывае нялёгка заўважыць сярод нагрувашчвання «мінусаў» што-небудзь станоўчае, нават прыкладнае. З вуснаў у вусны перадаецца амаль устойлівае словазлучэнне «дрэнная група». Але чаму яна дрэнная? Хто меў права начапіць такі ярлык, паставіць чорнае кляймо на твар калектыву, дзе вучацца, жывуць людзі.

На геаграфічным факультэце мне прапанавалі пазнаёміцца з адстаючай групай. Па паспяховасці ў зімовую сесію яна самая апошняя.

— Калектыву там няма. Камсорг ніяк не можа наладзіць кантакт з таварышамі. Не хочуць яны брацца за справу, — адрэкамендаваў сакратар камітэта камсамола Лёдзік Лысёнак.

Сітуацыя не унікальная. І не стрэсавая. Ёсць чыста фармальныя групы, ёсць камсамольцы, што з адкрытай іроніяй ставяцца да камсамольскіх клопатаў, а на актывістаў пазіраюць як на безнадзейных фанатыкаў. Колькі б не біўся той самы актывіст, колькі б не даказваў і не пераконваў, ён часам не ў сілах зрушыць сцяну абыякавасці.

Нечым накшталт такой сцяны ўяўлялася мне другая група першага курса. А камсорга Таццяну Кругленя хацелася пашкадаваць. Як сказаў Уладзімір Саўчанка, камсорг першага курса геаграфічнага факультэта, Таня сапраўдны арганізатар, мае багаты вопыт, была на камсамольскай рабоце ў тэхнікуме, але трапіла яна да людзей, з якімі не можа плённа працаваць, не можа іх запаліць сваім агеньчыкам. Гэта сказаў У. Саўчанка і яшчэ дадаў: «Не любіць група камсорга. На справаздачна-выбарным сходзе Таню абавязкова перавыберуць».

Для такіх сур'ёзных вывадаў патрабуюцца сур'ёзныя падставы. А ці былі яны ў Саўчанкі? Бадай, не. Бо ні на адным камсамольскім сходзе ў другой групе ён не прысутнічаў. Няўжо можна меркаваць што-небудзь у гэтым плане, падлічваючы колькасць акадэмічных запазычанасцей ці чытаючы сухія радкі пратаколаў?

Спачуваюць Тані, маўляў, не пашанцавала. І толькі яна, як ні дзіўна, не лічыць сябе няўдачніцай:

— Няпраўда, што наша група такая ўжо дрэнная. Не, яна не горшая за іншыя, можа нават лепшая. Вось, напрыклад, у конкурсе мастацкай самадзейнасці мы занялі першае месца. Першае! Хадзілі разам у тэатр...

Факты, пералічэнні. Калектыў? Цяжка сказаць, ці ёсць ён. Яшчэ не паспеў скласціся. Вельмі ўжо розныя людзі.

— У групе вялікая ўзроставая розніца. Чалавекі 4—5 паступілі пасля школы, у астатніх розны стаж работы. Цяжка знайсці ім агульнае, семнаццаці- і дваццацітрохгадовым. (Аляўціна Макарава, студэнтка другой групы першага курса).

Студэнты мяркуюць, вагаюцца. Дружная група ці не? Адны схіляюцца да станоўчага адказу, другія... Не, усё ж станоўчага больш.

— Дружныя мы, бо развіта пачуццё ўзаемадапамогі...

— Дружныя. Цікавыя мерапрыемствы праводзім...

І зноў называюць конкурс мастацкай самадзейнасці. Камусьці больш за ўсё запомніліся суботнікі (іх было чатыры). Пачалі выкладваць свае планы: з'ездзіць у Хатынь, схадзіць у паход, наведаць адзін з футбольных матчаў на стадыёне «Дынама»...

Звычайныя людзі, звычайныя справы. І трэба ўжо прымусіць сябе ўспомніць, што гэта група залічана ў «разрад дрэнных».

— У значнай колькасці нашых студэнтаў вялікі перапынак пасля школы. Многае забылася, не так проста, папрацаваўшы 2—3 гады, перастроіцца на вучэбны лад (камсорг Таццяна Кругленя).

Не так проста. Гэта паказалі вынікі першай сесіі. Уласная паспяховасць устрывожыла саміх студэнтаў. Вучэбны працэс—пастаянная тэма размовы на камсамольскіх сходах. Паяўляецца ўзаемадапамога, што называлася кімсьці з камсамольцаў як крытэрый згуртаванасці. Група шукае рэзервы.

Так, група. Група плануе паходы, хоча лепш здаць наступную сесію. Група — гэта ўсе 24 камсамольцы, у тым ліку і камсорг.

— Таццяна — пачынальніца нашых лепшых спраў, можна толькі пазайздросціць яе энтузіязму.

— Мне падабаецца яе прамалінейнасць і адкрытасць.

— На суботнікі Таня прыходзіць першай, і яе заслуга ў тым, што ўсе чатыры разы наша група працавала ў поўным саставе.

— Мы задаволены камсоргам...

Тое ж самае напісана ў ананімных анкетах. Адсюль вынікае, што не існуе ніякага неразумення паміж камсоргам і калектывам, што другая група першага курса геаграфічнага факультэта жыве сваім адметным жыццём, што вучацца ў ёй звычайныя юнакі і дзяўчаты, якія толькі пачынаюць старонку камсамольскай біяграфіі ў сценах універсітэта. І вельмі шкада, што амаль адразу пасля свайго нараджэння гэта група трапіла ў лік дрэнных. Сапраўды трапіла, бо студэнты, сталыя людзі з працоўным стажам, не змаглі адразу пераарыентавацца на вузаўскую сістэму навучання, бо сакратар камітэта камсамола факультэта разглядае вучэбны працэс як адзіны крытэрый для характарыстыкі камсамольскай работы ў групе.

Я не адмаўляю галоўную запаведзь студэнта. Безумоўна, перш за усё вучоба, я не супраць таго, што яна — аснова асноў. Але ж, згадзіцеся, не вучобай адзінай жывём. І, ацэньваючы камсамольскую работу, трэба аб'ектыўна разглядаць усе бакі дзейнасці. Калі ў групе ў цэлым дрэнная паспяховасць, гэта далёка не значыць, што там адсутнічае калектыў, або актыўнасць камсорга сутыкаецца з «пасіўнасцю мас». Вельмі б хацелася, каб сакратар камітэта камсамола геафака зацікавіўся, чаму другая група першага курса горш за іншыя здала экзамены зімовай сесіі і як яна зараз выпраўляе становішча. Каб пагутарыў ён з самімі студэнтамі, улічыў іх меркаванні, клопаты. Доўга б у такім разе прыйшлося вагацца, перш чым вынесці суровы прысуд. І хутчэй за ўсё не мела б тады другая група абразлівага азначэння «дрэнная».

А. ГРЫШКЕВІЧ,
наш спец. кар.

ПАЧАЦЬ З ПАЧАТКУ

ЗВЫЧАЙНЫ РАНАК. Ленінскі праспект у гэты час асабліва гаманлівы, ажыўлены. Спяшаюцца ўсе. Універсітэцкія дзверы грукам адлічваюць уваходзячых.

«Бэмц!» — дзяўчына з сумкай цераз плячо. Адляцеўшыя дзверы перахапіў юнак у акулярах.

«Ба-ба-х!»—эстафету прынялі двое з «дыпламатамі».

«Трах!» — весела ўвалілася чародка студэнтаў.

І раптам — цішыня: «Праходзьце, калі ласка!» Можна не правяраць — у 99 выпадках са ста гэта выкладчык.

Далей дзвярная «тэма з варыяцыямі» ідзе ў той жа шумавой апрацоўцы... да чарговага выкладчыка.

Рэзультаты назіранняў апісваю знаёмым студэнтам. Смяюцца — правільна заўважана. І перастаюць смяяцца, пазнаўшы, што многія аўтары папулярных брашур раяць: «Хочаце даведацца, ці культурны ваш спадарожнік, паназірайце, як ён абыходзіцца з дзвярыма. Многае зразумееце». Жарты жартамі, аднак... Як могуць падвесці гэтыя дробязі!

Прадбачу шквал скаргаў:

— Ды што там дзверы. Як яны адзін з адным размаўляюць!

— І выкладчыкам грубіяняць!

— А ў якім выглядзе ходзяць, быццам не ва універсітэт, а на рыбалку сабраліся!

Шмат пра што можна было б пагутарыць. Шмат што прыпомніць. Шмат на што звярнуць увагу. Але ёсць адзін аргумент, супраць якога асабліва не паспрачаешся:

— Гэтага мы не праходзілі.

Ні ў школе (у падручніках па этыцы пытанням культуры паводзін, эстэтычнаму выхаванню ўдзяляецца не так многа месца). Ні ва універсітэце — няма калі. Гэтую азбуку больш вязучыя праходзяць дома пад кіраўніцтвам бацькоў, менш — самастойна, метадам спроб і памылак. Згадзіцеся, выхад не лепшы. І можа няёмка было б гаварыць пра недахопы выхавання амаль дарослых людзей, калі б самі яны не білі трывогу, калі б не заўважалі: цяжка працаваць з людзьмі, трэба вучыцца натуральным рэчам, часта бывае сорамна за сябе саміх. І, набыўшы пэўны вопыт, адзначаюць: выдатныя адзнакі, поспехі ў мастацкай самадзейнасці, цікавыя паведамленні на навуковых канферэнцыях яшчэ не вызначаюць ступені культуры, не даюць права аўтаматычна лічыцца выхаваным чалавекам. ВНУ — не гарантыя інтэлігентнасці. Вось і атрымліваюцца нейкія «нажніцы» паміж адукаванасцю і ступенню культуры. І пачынаць барацьбу з імі трэба... з пачатку. З дробязей. З тых жа дзвярэй. І не толькі з іх.

РАЗМОВЫ, РАЗМОВЫ...

— НІЯК НЕ МАГУ СУПАКОІЦЦА. Сорамна,—дзялілася са мной Галка, студэнтка мехмата. — Уяўляеш, па гісторыі КПСС вайну праходзілі, Вялікую Айчынную. Нам прапанавалі: назавіце кнігі, фільмы, карціны, прысвечаныя Сталінградскай бітве. Адзін «Гарачы снег» успомнілі, і то з цяжкасцю. Ну чаму мы нічога не ведаем?!

Што я магла сказаць? Тое, што многае залежыць ад уласнага жадання? Што ёсць такія паняцці, як самаадукацыя і самавыхаванне? Што мы часта самі вінаваты ва ўласным невуцтве? Магла. Але ж не сказала. Спачатку проста пашкадавала. А потым задумалася: «Чаму ва ўсіх «смяротных грахах»—ці то прапушчаныя лекцыі, ці то недастаткова высокая ступень

„Гэта мы не праходзілі...“

17 лютага гэтага года артыкулам дэкана механіка-матэматычнага факультэта М. Гарашчука газета пачала дыскусію «Культурны чалавек. Які ён?» У ходзе падрыхтоўкі матэрыялаў высветлілася, што тэма дыскусіі вызначана не зусім удала. Дакладней было б — «ВНУ і культура: шляхі ўзаемасувязі». Іменна гэтым пытанням прысвечаны нататкі карэспандэнта. Адразу агаворымся: само паняцце культуры мы не разглядаем толькі як уменне арыентавацца ў «прэстыжных» праблемах мастацтва ці імкненне з усіх сіл «быць на ўзроўні». Мы паспрабуем абмеркаваць наступнае: як выхаваць у маладога чалавека не спажывецкія, а творчыя адносіны да культурнага багацця. Як дапамагчы яму стаць сапраўды інтэлігентным чалавекам. Таму, калі размова ідзе аб культуры, маецца на ўвазе культура паводзін, пачуццяў, зносін, эстэтычная культура асобы. Думаецца, усім аспектам гэтай тэмы знойдзецца месца на газетных старонках.

агульнай эрудыцыі — мы схільны абвінавачваць толькі студэнта?» Калі разабрацца—ён і абвінавачваемы і пацярпеўшы адначасова.

— Трэба ж. Усё жыццё лічыў сябе культурным чалавекам, а тут — на табе, не падыходжу. Хто такі Феліні, бачыце, не ведаю, — абураецца «цяхнар»-пяцікурснік, расказваючы пра няўдалае спатканне з дзяўчынай.

Увогуле яму можна паспачуваць: без пяці мінут спецыяліст, дыплом амаль што ў кішэні і... некультурны?

...Размовы, размовы. Тэсты на выяўленне «каэфіцыента інтэлектуальнасці» — нарасхват, кнігі з красамоўнай назвай «Як сябе паводзіць» зачытваюцца да дзірак, газеты і часопісы літаральна тонуць у пытаннях: «Як стаць асобай? Адкажыце хутчэй. Мне гэта вельмі патрэбна». Усміхнуцца наіўнасці? Падзівіцца інфантыльнасці? Растлумачыць: асоба будуецца ўсё жыццё, а той, хто хоча стаць культурным чалавекам, урэшце стане ім? Доўга можна разважаць, а ў адказ пачуць усё тое ж:

— Гэтага мы не праходзілі.

Сапраўды, за абавязковым мінімумам ведаў, спасціжэнне якіх патрабуе ад большасці студэнтаў максімуму намаганняў, лягчэй лёгкага праглядзець нешта галоўнае: той інтэлектуальны і эмацыянальны багаж, які назапашваецца ў юнацтве. Размова тут не ідзе пра снабісцкія гутаркі на модныя тэмы, абавязковыя — пад страхам адлучэння ад выбранага кола — прагляды прэм'ер ці ўменне «с ученым видом знатока хранить молчанье в важном споре». Не салоннай балбатнёй вызначаецца чалавечая сутнасць. Справа ў іншым — як і чым адказаць на гэта настойлівае: «Ну чаму мы так мала ведаем?» Асабліва пакутуюць тыя, у раскладзе заняткаў якіх не значыцца літаратура і гісторыя, каму замест гамераўскай «Адысеі» даводзіцца здаваць супрамат. Не выпадкова на пытанне: ці патрэбна студэнтам прыродазнаўчых факультэтаў увядзенне факультатыўных курсаў, прысвечаных пытанням выяўленчага, кіна- і тэатральнага мастацтва, сучаснай савецкай і замежнай літаратуры? — дваццаць з дваццаці трох апытаных далі станоўчыя адказы, а нехта з уласцівым юнацтву максімалізмам дадаў: «Якія факультатывы?! Патрэбны абавязковыя курсы». І для большай перакананасці слова «абавязковыя» падкрэсліў двойчы.

Дык што, выхад знойдзены? Застаецца толькі распрацаваць і зацвердзіць факультатыўныя курсы, адшукаць выкладчыкаў, дарэчы, тут справіліся б і гуманітарыі-старшакурснікі, замацаваць міжфакультэцкія сувязі, і ўсё пойдзе на лад? У ідэале так. А на справе?

— Якія там факультатывы?! І так нічога не паспяваем.

Як «акультурыць» аўтара гэтай рэплікі? Здаецца, яму акрамя гучнага імя — «дыпламаваны спецыяліст» — нічога іншага і не трэба.

Як праводзіць заняткі, каб зацікавіць слухачоў, зрабіць іх аднадумцамі, сааўтарамі, далучыць да актыўнага ўспрымання мастацкага твора?

Як падабраць групы?

Як знайсці адпаведную форму заняткаў?

Як... У кожнай новай справе непазбежна паяўляюцца гэтыя «як», і так жа непазбежна знікаюць, калі бяруцца за гэтую справу па-сапраўднаму, без скідак на «аб'ектыўныя складанасці» і навізну. І без размоў, карысных на стадыі абмеркавання і лішніх у час ажыццяўлення.

ШТО СКАЗАЛІ ФІЗІКІ

Дакладней, іх дэкан — Эдуард Міхайлавіч Шпілеўскі. А размаўлялі мы, трэба сказаць, у абстаноўцы больш чым прыемнай і па прычыне, прызнаюся прама, нечаканай.

Мяккая мэбля, сучасны інтэр'ер, прыемная ціхая музыка, утульна мурлыча самавар... Сюды, у прафесарскую фізфака, выкладчыкі забягаюць не толькі для таго, каб скінуць паліто ці, у які ўжо раз, пачуць, што студэнт Н. зноў дастаў недзе даведку аб вызваленні ад заняткаў. Сюды прыходзяць адпачыць. І студэнтам уваход таксама не забаронены, асабліва калі экспануюцца выстаўкі. Так, так, выстаўкі. Нядаўна сваё майстэрства дэманстраваў дацэнт кафедры тэарэтычнай фізікі, кандыдат фізіка-матэматычных навук Г. В. Шышкін. Ён захапляецца выпальваннем па дрэву. Знайшлося месца і дзіцячай творчасці— цікавыя вырабы з прыроднага матэрыялу хочаш-не хочаш, а прымусяць добра ўсміхнуцца. І вось зараз — карціны беларускіх мастакоў.

Як нарадзілася ідэя такой выстаўкі на фізфаку? Хто яе ініцыятар? Калі збіралася на факультэт, цікавілі іменна гэтыя пытанні. А на месцы высветлілася, што размова пойдзе шырэй — аб цэлай праграме маральна-эстэтычнага выхавання студэнтаў. Аб выхаванні прыгажосцю.

— Сваёй мэтай мы ставім выхаванне прафесіянала, — гаворыць Эдуард Міхайлавіч. — Але прафесіяналізм — паняцце шматграннае і не вызначаецца толькі працоўнымі поспехамі. Гэта комплекс, адным са складаемых якога з'яўляецца эстэтычнае выхаванне. Аднойчы ў час грамадска-палітычнай практыкі мы высветлілі невысокі агульны ўзровень нашых студэнтаў; асабліва відавочнымі былі прагалы ў пытаннях культуры, у прыватнасці беларускай, і занепакоіліся. Арганізавалі сустрэчы з артыстамі, пісьменнікамі, знаўцамі беларускага мастацтва. Зразумелі, справа патрэбная і цікавая. Дарэчы, на адной з такіх сустрэч мы і пазнаёміліся з Анатолем Яфімавічам Белым — выкладчыкам філасофіі і страсным калекцыянерам. Анатоль Якаўлевіч прапанаваў правесці на факультэце выстаўку твораў беларускіх мастакоў. З радасцю згадзіліся.

Але акрамя такіх тэрміновых «акцый» існуе і іншая форма далучэння студэнтаў да духоўнага скарбу чалавецтва. Куратарская гадзіна. Яна стаіць у раскладзе заняткаў. У месяц выпадае чатыры-пяць такіх гадзін, і адна-дзве з іх абавязкова адводзяцца для гутаркі аб новай выстаўцы, цікавым фільме, чарговай публікацыі ў літаратурным часопісе. Такія пастаянныя, можна сказаць планавыя, мерапрыемствы настройваюць на пэўную хвалю ўспрымання, ствараюць патрэбную агульную атмасферу. І, што таксама важна, — у нейкай ступені вырашаюць праблему часу. Вечарам, напэўна, не ўсе сабраліся б на гутарку, а калі яна па раскладу... Нават і не вельмі цікавыя застануцца. І, спадзяёмся, не пашкадуюць.

Куратарскія гадзіны — куратарскімі гадзінамі, але на стале ў дэкана ўжо ляжыць праграма факультатыўнага курса «Асновы кінамастацтва». Эдуард Міхайлавіч узважвае, прыкідвае, можа, з наступнага года і паспрабуе ўвесці ў праграму. Адчуваю — патрэбна.

ЯК ГЭТА РОБІЦЦА

НА ЖАЛЬ, амаль што ніяк, таму апошняя глаўка будзе, відаць, самай маленькай. Некаторыя з выкладчыкаў узялі на сябе асветніцкую місію, так сказаць на грамадскіх пачатках. Той жа А. Я. Белы праводзіць гутаркі на тэмы: «Дзеячы беларускай культуры ў выяўленчым мастацтве», «Янка Купала, Якуб Колас і выяўленчае мастацтва», дзе выкарыстоўвае матэрыялы з уласнай калекцыі графічных работ, значную частку якіх, дарэчы, рыхтуецца падарыць універсітэту. На кожнай звычайнай лекцыі 5—10 хвілін удзяляе навінам культурнага жыцця рэспублікі, раіць, куды схадзіць, што паглядзець. Яго калега—выкладчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў Алег Іванавіч Цітоў—вялікі знаўца рускага жывапісу, таксама амаль увесь свой вольны час праводзіць са студэнтамі. Што сказаць? Добра, калі ёсць такія энтузіясты. А калі няма? Ды і на адным энтузіязме далёка не даедзеш. Патрэбны дасканала распрацаваныя, на прафесійным узроўні падрыхтаваныя курсы. Скажаце, неажыццявіма? На ўсіх факультэтах Растоўскага дзяржаўнага універсітэта студэнты «праходзяць» праграмай прадугледжаныя курсы: «Уводзіны ў агульную тэорыю і гісторыю культуры», «Гісторыя выяўленчага мастацтва», «Актуальныя праблемы сучаснай літаратуры і крытыкі». І, думаю, праслухаўшыя гэтыя курсы на пытанне: як часта вы бываеце ў Палацы мастацтваў? — не адказалі б: наогул не былі. А частка «нашых» студэнтаў пакуль што адказвае іменна так. І даволі значная частка.

Н. КАЛІШЭВІЧ,
наш. кар.

НА ЗДЫМКАХ: тэма гутаркі А. Я. Белага: «Дзеячы беларускай культуры ў выяўленчым мастацтве».

Выстаўка твораў беларускіх мастакоў на фізічным факультэце.

● АЛІМПІЯДА ЗАМЕЖНЫХ СТУДЭНТАЎ

Ці ведаеце вы рускую мову?

КОЖНЫ ГОД праводзіцца Усесаюзная алімпіяда па рускай мове сярод замежных студэнтаў, што вучацца ў ВНУ Савецкага Саюза. Алімпіяда праходзіць у тры туры: I — унутрывузаўскі, які дазваляе ўкамплектаваць зборныя каманды ВНУ, якія затым прымаюць удзел у II туры — рэспубліканскім. Пераможцы гэтага тура абараняюць гонар нашай рэспублікі ў III, заключным туры, які праходзіць у Маскве.

Нядаўна ў БДУ імя У. І. Леніна праходзіў II тур «Алімпіяды-83». У алімпіядзе ўдзельнічалі каманды замежных студэнтаў пяці ВНУ: універсітэта, БПІ, БІМСГ, Інстытута народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава, БТІ імя С. М. Кірава. У першы дзень удзельнікам былі прапанаваны тры тэмы для пісьмовых сачыненняў: «СССР — 60 гадоў», «Космас пакараецца адважнымі», «Над нашай планетай адно неба». Па рэзультатах пісьмовых работ камісія дапусціла да вуснай гутаркі 15 студэнтаў, якія атрымалі адзнакі «выдатна» і «добра» па сачыненнях. На вуснай гутарцы ўдзельнікам алімпіяды былі прапанаваны пытанні па трох асноўных тэмах: «Савецкі Саюз», «НТР і культура», «Мая спецыяльнасць». Пры адказах ацэньваліся веды па тэме, агульная эрудыцыя кожнага ўдзельніка, узровень валодання рускай мовай. эмацыянальнасць адказу, культура мовы.

Усе ўдзельнікі алімпіяды паказалі глыбокія веды па гісторыка-рэвалюцыйнаму мінуламу нашай краіны, важнейшых праблемах сучаснасці, прадэманстравалі шырокую эрудыцыю па пытаннях савецкай навукі, літаратуры, мастацтва, высокі ўзровень валодання моўнымі сродкамі для выказвання сваіх думак і пачуццяў.

Лепшымі былі прызнаны адказы студэнтаў універсітэта Берціна Нзеламоны (Конга, I месца), Янкі Маранговай (ЧССР, II месца), студэнта Інстытута народнай гаспадаркі Леніна Манцьеля (Венесуэла, III месца) і студэнта БІМСГ Валянціна Шурака (ПНР, IV месца). У кастрычніку ў Маскве яны будуць прадстаўляць нашу рэспубліку на заключным туры Усесаюзнай алімпіяды.

У камандным заліку пераможцам тура і прадстаўнікам каманд-прызёраў старшыня камісіі загадчык кафедры рускай мовы па навучанню замежных студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна дацэнт В. В. Равіцкі ўручыў Ганаровыя граматы і памятныя сувеніры.

У. БУДАЙ,
кіраўнік інтэрпрэс-цэнтра.

НА ЗДЫМКУ: уручэнне грамат пераможцам алімпіяды.

● З НАШАЙ ПОШТЫ

ДАПАМОГА СЯБРОЎ

СІРЫЯ — невялікая краіна на Блізкім Усходзе —адзначае 37-ю гадавіну незалежнасці. Усім добра вядома, якое складанае і напружанае становішча пануе зараз на Блізкім Усходзе. Імперыялізм, рэакцыя і міжнародны сіянізм робяць замах на нашу нацыянальную незалежнасць, імкнуцца знішчыць прагрэсіўныя дасягненні ў эканамічным развіцці краіны.

Наш народ няўхільна ўмацоўвае свае сяброўскія сувязі з сацыялістычнымі краінамі, і ў першую чаргу з Савецкім Саюзам. СССР аказвае нашай краіне дапамогу ў будаўніцтве чыгунак, развіцці нафтавай і хімічнай прамысловасці, падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў ва ўсіх галінах. Савецкі Саюз дапамагае ствараць трывалы фундамент сацыяльна-эканамічнага развіцця і г. д.

Сімвалам шчырага сяброўства паміж народамі Савецкага Саюза і Сірыі з'яўляецца гідрастанцыя на рацэ Яўфрат. Яна дае амаль 70 працэнтаў усёй электрычнай энергіі, якая выпрацоўваецца ў краіне.

Наш народ выказвае вялікую удзячнасць савецкім сябрам за дапамогу ў справе падрыхтоўкі кваліфікаваных нацыянальных кадраў.

АБДУЛЬКАДЫР АБДУЛЬМАДЖЫД,
член інтэрпрэс-цэнтра.

НЕ ПЕРШЫ ГОД у сярэдняй школе № 12 г. Мінска працуе педатрад факультэта радыёфізікі і электронікі. За гэты час нямала добрых спраў зроблена студэнтамі універсітэта. Самому мне давялося ўжо на першым курсе пачаць работу ў педатрадзе, а ў лю-

● МЫ — ШЭФЫ

ДЗЕЙНІЧАЕ ГУРТОК

тым 1980 г. А. Богуш, яго камандзір, прапанаваў мне арганізаваць работу шахматнага гуртка ў школе.

Не ўсё спачатку было гладка. Жадаючых займацца ў гуртку было шмат. Але ступень іх падрыхтоўкі была вельмі розная, што выклікала дадатковыя цяжкасці. Таму першы год значных поспехаў гурткоўцы не дабіліся.

Восенню гурток, ён ужо называўся шахматны клуб «Аскар», аднавіў сваю работу. Мне сталі дапамагаць студэнты нашага факультэта В. Дубоўскі і В. Шаўцоў. Прайшло яшчэ два гады. Нашы чацвёртакласнікі і пяцікласнікі сталі гуляць у шахматы лепш. І калі ў 1980 годзе на першынстве раёна школьнікі малодшых класаў занялі перадапошняе, 7-е месца, то ў мінулым годзе — ужо трэцяе.

Мне думаецца, далёка не выпадкова тое, што пасля напружаных заняткаў нашы студэнты знаходзяць час, каб паехаць у школу. Работа з дзецьмі вучыць вельмі многаму. Па-першае, яна выхоўвае ў чалавека самадысцыпліну, адказнасць за свае ўчынкі і за свае словы. Тое, што сказаў, што паабяцаў—патрэбна выканаць.

І яшчэ адзін момант хочацца адзначыць. Кожнаму з нас праз пэўны час прыйдзецца працаваць з людзьмі, кіраваць імі. Шэфства над школьнікамі выпрацоўвае тое чуццё, якое дапамагае збліжацца з людзьмі.

А. ЦЕРАХАЎ,
член камітэта камсамола факультэта радыёфізікі і электронікі.

● КАНФЕРЭНЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ

ДЗЕНЬ КНІГІ

АБ СВЯЦЕ КНІГІ, што праводзілася на факультэце журналістыкі, студэнты і выкладчыкі даведаліся загадзя. І вось у назначаны дзень і час у актавай зале сабраліся чытачы, каб пагаварыць аб значэнні кнігі ў жыцці кожнага чалавека, аб карысці, якую яна прыносіць.

Дацэнт кафедры гісторыі журналістыкі А. І. Раковіч падкрэсліў важнасць слоў А. М. Горкага: «Чалавеку нельга адмовіць у дзвюх рэчах: у хлебе і ў кнізе». Чалавек, які не сустракаецца з кнігай, памірае духоўна.

А. І. Раковіч пажадаў будучым журналістам ніколі не расставацца з кнігаю, падзякаваў тым, хто дае ёй жыццё.

Ад выдаўцоў выступіла загадчыца рэдакцыі літаратуры па філалогіі, журналістыцы, педагогіцы выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна І. В. Смяян.

Яна расказала, што з 200 аркушаў, выпускаемых рэдакцыяй за год, пятую частку складае літаратура па журналістыцы.

За апошнія дзесяць гадоў выйшла больш як 50 кніг, напісаных выкладчыкамі-журналістамі. Сярод іх можна назваць манаграфіі дэкана факультэта, прафесара П. І. Ткачова «Иду на «вы», «Границы жанра», «Сатиры злой звенящая строка»; прафесара Е. Л. Бондаравай «Время, экран, критика», «Кинолента, длиною в жизнь», узнагароджаныя дыпломамі III ступені; М. Я. Цікоцкага «Сугучнасць слоў жывых» і многія іншыя.

Папулярнасцю ў чытачоў карыстаюцца даследаванні прафесара Б. В. Стральцова «Аналітычныя жанры», «Публіцыстычнасць інфармацыйных жанраў», «Публіцыстыка, жанры, майстэрства», зборнік «Праблематыка газетных выступленняў», падрыхтаваны кафедрай тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі.

Высокую ацэнку атрымала «Гісторыя беларускай журналістыкі» (аўтары Р. В. Булацкі, І. І. Сачанка, С. В. Говін).

Патрэбна адзначыць слоўнікі «Трудные случаи употребления близких по звучанию слов», «Межъязыковые омонимы и паронимы» С. М. Грабчыкава, якія так неабходны студэнтам і журналістам-практыкам

Актыўна працуе над зборнікам «Культура мовы журналіста» кафедра стылістыкі і літаратурнага рэдагавання. Першы выпуск яго выйшаў ў 1982 годзе, другі выйдзе ў 1984. На гэты год запланаваны чатыры работы па журналістыцы.

Таваразнаўца Цэнтральнага кніжнага магазіна Л. Н. Разанцава расказала студэнтам аб сістэме папярэдніх заказаў, аб важнасці гэтай работы.

З аглядам літаратуры па спецыяльнасці, што маецца ў асартыменце магазіна, выступіла выпускніца факультэта журналістыкі карэспандэнт БЕЛТА Л. Ламсадзе.

Кожнаму студэнту-журналісту патрэбна мець сваю бібліятэку. Журналісту недастаткова толькі асабістых назіранняў. Каб напісаць добры матэрыял, патрэбна глыбока вывучыць тэму, ужыцца ў яе, перачытаць шмат літаратуры. Гэтыя думкі прагучалі ў выступленні загадчыка аддзела культуры часопіса «Беларусь» В. Жука.

Дэкан факультэта П. І. Ткачоў, падводзячы вынікі, падкрэсліў важнасць і карысць падобных сустрэч. У вестыбюлі студэнты і выкладчыкі азнаёміліся з багатым асартыментам кніг, падабраных для кіёска работнікамі Цэнтральнага кніжнага магазіна, набылі мастацкую літаратуру і літаратуру па спецыяльнасці.

А. ЗЯНЬКЕВІЧ,
рэдактар па прапагандзе і рэкламе літаратуры выдавецтва БДУ.

ПАЧЭСНЫ АБАВЯЗАК

Высакародная і гуманная місія донара. Прыемна ўсведамляць, што многія студэнты і супрацоўнікі універсітэта штогод здаюць сваю кроў.

Па выніках 1982 года першае месца занялі слухачы падрыхтоўчага аддзялення. Актыўныя донары студэнты біялагічнага факультэта. Не ўсвядомілі вялікай важнасці донарства студэнты фізічнага, механіка-матэматычнага, філалагічнага факультэтаў, факультэта журналістыкі.

М. БАЁК,
старшыня камітэта арганізацыі таварыства «Чырвонага Крыжа» універсітэта, кандыдат медыцынскіх навук.

Фотаэцюд **В. Шачака.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

21 красавіка 1983 г.

Зак. 767. АТ 04180

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ